3. Растлумачце, чаму тэрыторыя Заходняй Беларусі ў афіцыйных польскіх дакументах называлася «ўсходнімі ўскраінамі».
4. Ахарактарызуйце сацыяльна-палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы.
5. Канкрэтызуйце прыкладамі меркаванне: «Пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад Польшчы ў краі разгарнуўся актыўны нацыянальна-вызваленчы рух».

# § 16–17. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў

§ 16-17-1

§ 16-17-2

§ 16-17-3

§ 16-17-4

§ 16-17-5

У чым заключаліся асаблівасці геапалітычнага становішча Беларусі ў 1921–1939 гг.?

**Пачатак Другой сусветнай вайны.** Другая сусветная вайна працягвалася з 1 верасня 1939 г. па 2 верасня 1945 г. Развязаная нацысцкай Германіяй, фашысцкай Італіяй і мілітарысцкай Японіяй, вайна ўцягнула ў сваю арбіту 61 дзяржаву з насельніцтвам 1,7 млрд чалавек. Баявыя дзеянні вяліся на тэрыторыі 40 краін.

Лідары еўрапейскіх дзяржаў, праводзячы ў 1930-я гг. палітыку «прымірэння» агрэсара, спадзяваліся коштам саступак накіраваць агрэсію Германіі на Усход — супраць СССР. У гэты ж час (1938 і 1939 гг.) Чырвонай арміі давялося супрацьстаяць японскай агрэсіі каля возера Хасан, недалёка ад Уладзівастока, і ракі Халхін-Гол (Манголія). СССР ва ўмовах міжнароднай ізаляцыі апынуўся перад небяспекай вядзення вайны на два франты.

Каб выйграць час для ўмацавання абараназдольнасці краіны, адхіліць пагрозу стварэння адзінага антысавецкага фронту, савецкае кіраўніцтва пайшло на заключэнне 23 жніўня 1939 г. германа-савецкага дагавора аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў. Дагавор падпісалі ў Маскве народны камісар замежных спраў СССР В. Молатаў і міністр замежных спраў Германіі І. Рыбентроп.

Разам з дагаворам аб ненападзенні быў падпісаны «сакрэтны дадатковы пратакол», якім вызначаліся сферы ўплыву дзвюх дзяржаў. У сферу інтарэсаў СССР уваходзілі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна, што было актам гістарычнай справядлівасці, а таксама Усходняя Польшча, Латвія, Эстонія, Бесарабія.

Дагавор дазволіў савецкаму кіраўніцтву пазбегнуць вайны на два франты, выйграць час для падрыхтоўкі да адбіцця агрэсіі і разбурыць планы стварэння адзінага антысавецкага фронту.

1 верасня 1939 г. нацысцкая Германія напала на Польшчу. Англія і Францыя, каб не страціць свайго ўплыву ў Еўропе, вымушаны былі пад ціскам грамадскага меркавання 3 верасня аб’явіць вайну Германіі, але рэальных баявых дзеянняў не


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вялі. ЗША вырашылі застацца ў баку, заявіўшы 5 верасня 1939 г. аб сваім нейтралітэце.

**Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.** Германскія дывізіі, маючы вялікую перавагу ў тэхніцы, хутка прасоўваліся ўглыб польскай дзяржавы. У сярэдзіне верасня 1939 г. яны падышлі да мяжы Заходняй Беларусі. 16 верасня польскі ўрад збег на тэрыторыю Румыніі.

17 верасня 1939 г. часці Чырвонай арміі перайшлі савецка-польскую мяжу і пачалі вызваленне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Да 25 верасня Чырвоная армія цалкам вызваліла Заходнюю Беларусь.

28 верасня 1939 г. у Маскве быў падпісаны дагавор паміж СССР і Германіяй аб дружбе і граніцы. Усталёўвалася новая заходняя мяжа Савецкага Саюза па так званай «Лініі Керзана», вызначанай Вярхоўным саветам Антанты як усходняя мяжа Польшчы яшчэ ў 1919 г. Гэта была этнічная мяжа паміж беларусамі і палякамі. У «сакрэтным дадатковым пратаколе» была запісана дамоўленасць аб пераходзе тэрыторыі Літвы ў сферу ўплыву СССР. 10 кастрычніка 1939 г. па рашэнні савецкага ўрада Літве былі перададзены Вільня і прылеглыя тэрыторыі. Насельніцтва Заходняй Беларусі сустракала Чырвоную армію як вызваліцельніцу і аказвала дзейсную дапамогу. Чырвонаармейцаў падтрымлівалі ў першую чаргу бяднейшыя слаі насельніцтва, якія ўспрымалі савецкую ўладу як сваю. З прыходам савецкіх войскаў у заходнебеларускіх гарадах і паветах ствараліся часовыя ўправы — у ваяводскіх і павятовых цэнтрах, сельскія камітэты — у мястэчках і вёсках, пры якіх арганізоўваліся атрады рабочай гвардыі і сялянскай міліцыі. У склад часовых упраў і сялянскіх камітэтаў уваходзілі былыя члены КПЗБ, рабочыя, прадстаўнікі гарадской беднаты, беларускай інтэлігенцыі, бяднейшыя сяляне. Часовыя ўправы бралі пад свой кантроль прамысловыя прадпрыемствы. Сельскія камітэты размяркоўвалі зямлю і маёмасць памешчыкаў сярод беднаты. Адкрываліся новыя школы з беларускай мовай навучання.



Уступленне войскаў Чырвонай арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Верасень 1939 г.

28—30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку з мэтай заканадаўчага замацавання ўваходжання тэрыторый Заходняй Беларусі ў склад БССР прайшоў Народны сход Заходняй Беларусі. Кандыдаты ў дэпутаты Народнага сходу вылучаліся ад сялян, рабочых і інтэлігенцыі. Удзельнічаць у выбарах мелі права ўсе жыхары, якія дасягнулі

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



ДЕКЛАРАЦИЯ
Народного Собрания Западной Белоруссии
о вхождении Западной Белоруссии
в состав Белорусской Советской Социалистической Республики

ПРИНЯТА ЕДИНОГЛАСНО НА ЗАСЕДАНИИ 29 ОКТЯБРЯ 1939 г.

В тяжелый час, грозивший разорением и истреблением нашему народу, великий Советский Союз взял под свою защиту жизнь и имущество населения Западной Белоруссии.

С помощью непобедимой Рабоче-Крестьянской Красной Армии народы Западной Белоруссии освободились от господства помещиков и капиталистов. Навсегда миновали черные годы унижения белорусского народа под игом польских панов, попиравших элементарные права и национальное достоинство белорусского народа.

Трудящиеся Западной Белоруссии всегда считали себя связанными неразрывными кровными узами со своими братьями, построившими Советскую Социалистическую Белоруссию.

Трудящиеся Западной Белоруссии решительно требуют воссоединения доныне расчлененных двух частей единого белорусского народа, единой белорусской земли.

Считая волю белорусского народа высшим законом, Белорусское Народное Собрание постановляет:

Просить Верховный Совет Союза Советских Социалистических Республик и Верховный Совет Белорусской Советской Социалистической Республики принять Западную Белоруссию в состав Советского Союза и Белорусской Советской Социалистической Республики, воссоединить белорусский народ в единое государство и положить тем самым конец разобщению белорусского народа.

Только в составе Белорусской Советской Социалистической Республики народ Западной Белоруссии сумеет залечить глубокие раны, нанесенные ему долгими годами порабощения и с помощью великого Советского Союза поднять и преобразовать хозяйство, развить свою народную культуру, достойную свободного народа, и обеспечить расцвет благосостояния всех трудящихся Западной Белоруссии.

Да здравствует Белорусская Советская Социалистическая Республика!

Да здравствует наша могучая родина — великий Союз Советских Социалистических Республик!

29 ОКТЯБРЯ 1939г. ДЕКЛАРАЦИЯ НАРОДНОГО СОБРАНИЯ ЗАПАДНОЙ БЕЛОРУССИИ О ВХОЖДЕНИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛОРУССИИ В СОСТАВ БССР

ЦГАОР БССР

Дэкларацыя Народнага сходу Заходняй Беларусі аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР. 29 кастрычніка 1939 г.

18-гадовага ўзросту. У выніку выбараў было абрана 927 дэпутатаў.

Па прапанове дэпутатаў С. Прытыцкага і Ф. Манцэвіча Народны сход прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўнай уладзе і Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР. Былі прыняты таксама рэзалюцыі аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці.

14 лістапада пазачарговая III сесія Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіла Закон аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР.

У выніку ўз'яднання Беларусі тэрыторыя БССР павялічылася да 225,7 тыс. км$^2$, а насельніцтва — да 10,3 млн чалавек.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2021 г. 17 верасня аб'яўлена Днём народнага адзінства. Гэты дзень стаў актам гістарычнай справядлівасці ў дачыненні да беларускага народа, падзеленага супраць яго волі ў 1921 г. па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора.

*Ацаніце значэнне ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР.*

Адноўленае ў 1939 г. адзінства дазволіла Беларусі выстаяць у гады Вялікай Айчыннай вайны, заняць пачэснае месца ў міжнароднай супольнасці, стаць адным з сузаснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР.** 22 чэрвеня 1941 г. Германія без аб'яўлення вайны напала на Савецкі Саюз. Пачалася **Вялікая Айчынная вайна** (1941—1945 гг.). Ваенна-стратэгічная мэта гітлераўскага камандавання заключалася ў тым, каб, абапіраючыся на дактрыну «маланкавай вайны», у кароткі тэрмін (4—6 тыдняў) трыма групамі армій — «Поўдзень», «Цэнтр», «Поўнач» — разграміць асноўныя сілы Чырвонай арміі, захапіць важнейшыя ваенна-эканамічныя цэнтры (Масква, Мінск, Ленінград, Кіеў, Данбас, Закаўказзе), выйсці на лінію Архангельск — Астрахань.

На беларускім напрамку наступала германская група армій «Цэнтр». У першыя дні вайны праціўнік нанёс магутны ўдар па чыгуначных вузлах, ваенных аэрадро-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

мах, важных прамысловых цэнтрах Беластока, Брэста, Гродна, Баранавічаў і іншых гарадоў. У выніку хуткага прасоўвання варожых сіл значная колькасць савецкіх войскаў трапіла ў акружэнне. Заходняя Асобая ваенная акруга, пазней перайменаваная ў Заходні фронт, аказался ў катастрафічным становішчы.



Помнік экіпажу М. Ф. Гастэла.
Радашковічы. 1976 г.

На беларускай зямлі ў пачатковы перыяд вайны гітлераўцы сустрэлі супраціўленне, якога не зазналі ні ў адной з ваенных кампаній у Еўропе. Першымі ворага сустрэлі пагранічнікі. Ні адна з застаў не здалася ворагу і не пакінула свой участак без загаду. Насмерць стаялі на сваіх межах пагранічнікі застаў А. Кіжаватава, В. Усава, Ф. Кірычэнкі, А. Сівачова, воіны гарнізона Брэсцкай крэпасці, умацаваных раёнаў.

Адвагу і гераізм праявілі ваенныя лётчыкі Заходняга фронту. У паветраных баях было знішчана больш за 100 самалётаў праціўніка. У першыя гадзіны вайны лётчыкі П. Рабцаў, А. Данілаў, С. Гудзімаў таранілі варожыя самалёты. Неўміручыя подзвігі здзейснілі ў першыя дні вайны экіпажы капітанаў М. Гастэлы, А. Маслава, А. Аўдзеева, якія свае падбітыя самалёты накіравалі на вялікія групы ворага. Пры абароне Гомеля здзейсніў свой першы паветраны таран Б. Коўзан — адзіны ў свеце лётчык, які здзейсніў чатыры тараны і застаўся жывы.

Гераічнай старонкай стала абарона гарадоў Мінска, Полацка, Віцебска, Магілёва, Гомеля, Оршы і інш. Разам з чырвонаармейцамі ў складзе народнага апалчэння змагаліся і тысячы мясцовых жыхароў.

*Абмяркуйце, чаму Германіі не ўдалося рэалізаваць план «маланкавай вайны» ў СССР.*

Двухмесячнае супраціўленне Чырвонай арміі на тэрыторыі БССР садзейнічала зрыву гітлераўскага плана

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

«маланкавай вайны», дало магчымасць савецкаму ваеннаму камандаванню сканцэнтраваць рэзервы і правесці неабходныя абарончыя мерапрыемствы на маскоўскім напрамку.

Нягледзячы на мужнасць і гераізм савецкіх воінаў, войскі Чырвонай арміі не змаглі стрымаць наступленне праціўніка.

Гэта тлумачылася наступнымі прычынамі. Па-першае, нападзенне нацысцкай Германіі было вераломным і нечаканым. Па-другое, савецкія ўзброеныя сілы не былі своечасова прыведзены ў поўную баявую гатоўнасць з-за боязі справакаваць Германію на аб'яўленне вайны СССР. Па-трэцяе, было прынята памылковае рашэнне аб кансервацыі часткі абсталявання старой мяжы — «Лініі Сталіна». Быў выведзены асабовы склад, вывезены ўзбраенне, боепрыпасы, абсталяванне. Новая лінія ўмацаванняў — «Лінія Молатава» — на новай заходняй мяжы СССР толькі пачынала будавацца. Такое рашэнне пазбавіла Чырвоную армію неабходнай добра ўмацаванай другой паласы абароны. Па-чацвёртае, Германія і яе саюзнікі перавышалі СССР у людскіх і матэрыяльных рэсурсах, мелі вопыт паспяховых ваенных дзеянняў у Еўропе.

**Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.** На беларускай тэрыторыі кровапралітная вайна доўжылася 3 гады 1 месяц і 6 дзён. Захапіўшы Беларусь, акупанты ўсталявалі тут так званы новы парадак — рэжым тэрору, здзекаў з насельніцтва і гвалту.

Гэта быў загадзя распрацаваны, абдуманы і мэтанакіраваны план **генацыду**, ліквідацыі савецкага грамадства і дзяржаўнага ладу, рабавання нацыянальных багаццяў і прыродных рэсурсаў краіны. Ідэалагічнай асновай гэтай палітыкі з'яўлялася тэорыя нацыстаў аб «расавай перавазе» нямецкай нацыі над іншымі народамі, неабходнасці пашырэння «жыццёвай прасторы» для немцаў, «права» на сусветнае панаванне «трэцяга рэйху». У адпаведнасці з генеральным планам «Ост» германскія захопнікі планавалі пакінуць у Беларусі да 25 % мясцовага насельніцтва для анямечвання і выкарыстання ў якасці рабочай сілы. 75 % падлягалі высяленню альбо знішчэнню. Для рэалізацыі плана «Ост» была вызначана структура ваенных і паліцэйскіх акупацыйных улад.

Так, тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, амаль усёй Гомельскай, усходнія раёны Мінскай і некалькі раёнаў Палескай абласцей былі аднесены да вобласці армейскага тылу групы армій «Цэнтр». Улада на гэтай тэрыторыі знаходзілася ў руках камандавання ваенных і паліцэйскіх органаў.

Паўднёвыя раёны Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей былі далучаны да рэйхскамісарыята «Украіна». Беластоцкую вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай, частку раёнаў Баранавіцкай абласцей гітлераўцы ўключылі ў склад Усходняй Прусіі. Паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці былі далучаны да Генеральнай акругі «Літва».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Ваенна-адміністрацыйнае дзяленне акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1942)

Цэнтральная частка Беларусі была ўключана ў Генеральную акругу «Беларусь», якая складала 1/3 тэрыторыі даваеннай Беларусі з насельніцтвам 3,1 млн чалавек. Яна ўваходзіла ў склад рэйхскамісарыята «Остланд» з цэнтрам у Рызе і падзялялася на 11 акруг (гебітаў).

На пасаду генеральнага камісара Беларусі быў назначаны Вільгельм



Германскі патруль на Заходнім мосце ў Мінску (1941–1944 гг.)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Найбольш буйныя канцэнтрацыйныя лагеры і месцы масавага знішчэння савецкіх грамадзян на акупіраванай тэрыторыі Беларусі

1. *На аснове картасхемы сфармулюйце 3 тэзісы (факты) у даклад аб германскім акупацыйным рэжыме на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг.*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся аб нацысцкіх канцэнтрацыйных лагерах і месцах масавага знішчэння савецкіх грамадзян германскімі акупантамі ў вашым рэгіёне.*

Кубэ, а пасля яго забойства падпольшчыкамі ў канцы верасня 1943 г. — брыгадэнфюрар СС, генерал-лейтэнант паліцыі Курт фон Готберг.

Акупацыйны апарат уяўляў сабой эфектыўную машыну па рабаванні захопленай тэрыторыі, асноўнай задачай якога з'яўлялася эканамічнае забеспячэнне групы армій «Цэнтр».

На працягу акупацыі ў Германію вывозіліся прамысловае абсталяванне, сыравіна, лес, жывёла і іншыя рэсурсы. Ацалелыя прадпрыемствы перадаваліся ня-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Мемарыяльны комплекс «Азарычы»

мецкім фабрыкантам, а зямля — каланістам, былым памешчыкам. Разам з тым акупанты ў сваіх інтарэсах імкнуліся арганізаваць працу прамысловасці і транспарту, захаваць калгасы і саўгасы, наладзіць дзейнасць некаторых культурных і навуковых устаноў.

*Як вы думаеце, чаму германскія акупанты імкнуліся захаваць калгасы, наладзіць працу прамысловасці, навучальных і культурных устаноў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі?*

На прымусовыя работы ў Германію было вывезена амаль 400 тыс. жыхароў Беларусі. Каля паловы з іх не вярнуліся, памерлі альбо загінулі. На тэрыторыі Беларусі дзейнічала больш за 260 канцэнтрацыйных лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў. Па колькасці ахвяр (прыкладна 206,5 тыс. чалавек) лагер смерці Трасцянец, які знаходзіўся пад Мінскам, лічыцца буйнейшым пасля Асвенціма, Майданэка, Трэблінкі. У масавым парадку здзяйсняліся забойствы цыган, яўрэйскага насельніцтва Беларусі і яўрэяў, вывезеных з іншых краін Еўропы. Выяўлена больш за 530 месцаў іх знішчэння, лагераў, гета.

Адным з месцаў масавага знішчэння сталі «Азарыцкія лагеры смерці» — канцэнтрацыйныя лагеры, створаныя ў сакавіку 1944 г. на тэрыторыі Палескай вобласці (цяпер Гомельская), каля мястэчка Азарычы. У гэтым лагеры загінула каля 20 тыс. чалавек.

Захопнікі рэгулярна праводзілі карныя аперацыі (больш за 140 за перыяд акупацыі) з мэтай задушэння супраціўлення, занявольвання жыхароў акупіраванай тэрыторыі, рабавання маёмасці. У час карных аперацый знішчана 9200 вёсак, з іх 628 — разам з жыхарамі. Многія населеныя пункты знішчаліся па некалькі

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

разоў: 335 вёсак — двойчы, 123 — тройчы, 37 — чатыры разы і больш. Трагічным сімвалам гэтых злачынстваў стала спаленая вёска Хатынь.

Ахвярамі палітыкі генацыду стала амаль чвэрць насельніцтва Беларусі. Усяго ў рэспубліцы было знішчана больш за 2 млн 200 тыс. чалавек.

Гістарычныя дакументы сведчаць аб масавым знішчэнні фашысцкімі акупантамі беларускіх дзяцей. Дзясяткі тысяч дзяцей былі знішчаны ў канцэнтрацыйных лагерах. Толькі ў Баранавіцкім лагеры смерці загінула 5200 дзяцей і падлеткаў. Дзяцей выкарыстоўвалі ў якасці эксперыментальнага матэрыялу для медыцынскіх вопытаў на патрэбы «арыйскай медыцыны», у якасці донараў для лячэння параненых нямецкіх салдат. У лагеры на тэрыторыі вучэбнай гаспадаркі «Чырвоны Бераг» Жлобінскага раёна ў якасці донараў фашысты ўтрымлівалі 1990 дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў.

Акупанты вывозілі беларускіх дзяцей у Германію, усяго за гады акупацыі было вывезена 24 180 беларускіх дзяцей і падлеткаў. На Нюрнбергскім працэсе над ваеннымі злачынцамі быў прадстаўлены сакрэтны гітлераўскі мемарандум ад 12 мая 1944 г., у якім адзначалася, што запланаваная адпраўка з Беларусі ў Германію 40–50 тыс. падлеткаў ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў «мае на мэце не толькі не дапусціць умацавання ваеннай сілы ворага, але і скараціць яго біялагічны патэнцыял у будучыні».

**Дзейнасць калабарацыяніскіх арганізацый.** Няўдачы вермахта на савецка-германскім фронце, узмацненне барацьбы ў тыле акупантаў вымушалі германскія ўлады шукаць падтрымкі сярод мясцовага насельніцтва. З ліку мясцовых жыхароў ствараліся калабарацыяніскія органы і арганізацыі. **Калабарацыянізм** (ад фр. *collaboration* — супрацоўніцтва) — асэнсаванае, добраахвотнае і наўмыснае супрацоўніцтва з ворагам у яго інтарэсах і на шкоду сваёй дзяржаве. У народзе калабарацыяністаў называлі здраднікамі і гітлераўскімі памагатымі.

Першапачаткова немцы вербавалі пранацысцкія элементы з насельніцтва Заходняй Беларусі, а таксама з эміграцкіх цэнтраў у Празе і Берліне. Іх актыўна прыцягвалі для разлажэння польскай арміі, вядзення прапаганды сярод нацыянальных меншасцей, а затым для адбору і сартавання беларускіх ваеннапалонных пасля разгрому польскай арміі і акупацыі Польшчы.

Пасля з беларусаў камплектавалася падраздзяленне абвера Брандэнбург-800; з 1939 г. іх выкарыстоўвалі для закідвання малымі групамі на савецкія тэрыторыі.

Пазней гэтыя штурмавыя часці склалі аснову паліцыі Мінска і акругі «Беларусь». Акрамя таго, немцы прывезлі з сабой кадры грамадзянскай адміністрацыі, якія арганізоўвалі супрацьпартызанскія мерапрыемствы ў тыле армій групы «Цэнтр».

З ліку беларускіх дзеячаў, якія звязвалі свае надзеі з нацысцкай Германіяй, у кастрычніку 1941 г. была створана Беларуская народная самадапамога (БНС).


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

БНС займалася пытаннямі школьнай адукацыі, культуры, вярбоўкай і вывазам насельніцтва на прымусовую працу ў Германію. Вялася праца па стварэнні воінскай арганізацыі — Беларускага корпуса самаабароны (БКС), у задачы якога ўваходзіла барацьба супраць падпольшчыкаў і партызан. Беларускія калабарацыяністы, паліцаі насілі на левым рукаве ўніформы бел-чырвона-белыя павязкі альбо шаўроны-нашыўкі ў выглядзе бел-чырвона-белага сцяжка, на галаўных уборах — бел-чырвона-белы аколыш і какарду з «Пагоняй». У час урачыстых мерапрыемстваў выкарыстоўвалі бел-чырвона-белыя сцягі.




*Суаднясіце тэкст звароту да беларускай моладзі з мэтамі плана «Ост». Зрабіце вывад.*

Яны ўдзельнічалі ў карных аперацыях супраць партызан і мірнага насельніцтва, знішчэнні яўрэяў у гета, спальванні беларускіх вёсак.

У чэрвені 1943 г. акупанты стварылі маладзёжную арганізацыю — Саюз беларускай моладзі (СБМ). Планавалася, што выхаваная пад кіраўніцтвам М. Ганько і Н. Абрамавай на ідэях нацыянал-сацыялізму моладзь будзе карыстацца даверам беларускага народа. З актыву СБМ пазней набіраліся супрацьпартызанскія, дыверсійныя фарміраванні.

Са снежня 1941 г. існавалі нарматыўныя прадпісанні, якія рэгулявалі дзейнасць народных школ. Вучэбны працэс у школах меў прагерманскую скіраванасць. У кожным класе вывешваўся партрэт Гітлера, упрыгожаны з двух бакоў бел-чырвона-белымі стужкамі. Абавязковым прывітаннем былі словы «Жыве Беларусь» (як аналаг прывітання «Хайль Гітлер» для мясцовых жыхароў). Перад урокамі праводзіліся абавязковыя размовы пра біяграфію Гітлера, пра жыццё народаў у Новай Еўропе, перамогі войскаў вермахта. Вучэбныя праграмы былі прасякнуты расавай ідэалогіяй. Абавязковай з'яўлялася тэма «Арыйская раса як вышэйшая культурная і цывілізаваная раса чалавецтва». Школы, адкрытыя фашыстамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, былі элементам новага парадку, які яны насаджалі.

Школы, адкрытыя фашыстамі на акупіраванай тэрыторыі, рыхтавалі кадры для будучага забяспячэння акупацыйнага апарату. Веды даваліся фрагментарна. Вучню трэба было растлумачыць ваенныя мэты Германіі, расавую тэорыю, сфарміраваць у яго гатоўнасць да ўдзелу ў вайне на баку Германіі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Некаторыя прапановы рэйхсфюрара СС Г. Гімлера аб адносінах з мясцовым насельніцтвам усходніх абласцей [Не пазней за 25 мая 1940 г.]**

Мы ў вышэйшай ступені зацікаўленыя ў тым, каб ні ў якім выпадку не аб'ядноўваць народы ўсходніх абласцей, а, наадварот, драбніць іх на магчыма больш дробныя галіны і групы. Што ж датычыцца асобных народнасцей, мы не маем намеру імкнуцца да іх згуртавання і павелічэння, тым болей да паступовага прывівання ім нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай культуры… Прынцыповым пытаннем у вырашэнні ўсіх гэтых праблем з'яўляецца пытанне аб сістэме адукацыі і тым самым — аб адборы і фільтраванні моладзі. Для нямецкага насельніцтва ўсходніх абласцей не павінна быць вышэйшых школ. Для яго дастаткова наяўнасці чатырохкласавай народнай школы. Мэтай навучання ў гэтай народнай школе павінна быць толькі: простае лічэнне, самае вялікае да 500, уменне падпісацца, унушэнне, што боская запаведзь заключаецца ў тым, каб падпарадкоўвацца немцам, быць шчырым, старанным і паслухмяным. Уменне чытаць я лічу непатрэбным. Акрамя школы гэтага тыпу ва ўсходніх абласцях не павінна быць болей увогуле ніякіх школ…

*Якую мэту пераследавала нацысцкая палітыка, якая прадугледжвала стварэнне сістэмы адукацыі, апісанай у дакуменце? Падумайце, да якіх наступстваў для нашага народа яна магла прывесці.*

У чэрвені 1943 г. па ініцыятыве В. Кубэ была створана Беларуская рада даверу — дарадчы орган з прадстаўнікоў беларускай грамадскасці. Першым старшынёй Рады стаў В. Іваноўскі. У снежні 1943 г. Рада даверу была ператворана ў Беларускую цэнтральную раду (БЦР). Кіраўніком БЦР быў назначаны Р. Астроўскі.

Радзе было даручана правядзенне воінскай мабілізацыі. У сакавіку 1944 г. было сфарміравана і прыведзена да прысягі 45 батальёнаў Беларускай краёвай абароны (БКА), камандуючым якой быў назначаны Ф. Кушаль. Аднак гэтыя фарміраванні былі кепска ўзброеныя і практычна недзеяздольныя. Немцы лічылі гэтыя часці ненадзейнымі, з нізкай баяздольнасцю, але прыцягвалі іх да карных акцый (напрыклад, аперацыя «Кармаран» супраць беларускіх партызан Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны), да аховы канцлагераў.

У чэрвені 1944 г. калабарацыяністы правялі ў Мінску другі Усебеларускі кангрэс, які абвясціў сябе адзіным законным прадстаўніком беларускага народа. Але, не паспеўшы завяршыць працу, яго ўдзельнікі былі вымушаны хутка ўцякаць разам з нацыстамі на захад.

**Партызанскі рух і падпольная барацьба.** З першых дзён вайны пачалася праца па арганізацыі падполля і партызанскіх атрадаў.

Па звестках на 25 ліпеня 1941 г. у рэспубліцы было сфарміравана 118 партызанскіх атрадаў і груп. Ужо на пяты дзень вайны ў Пінскім раёне быў сфарміраваны


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У красавіку 1942 г. ва Уладзімірскай вобласці быў арганізаваны Асобы беларускі збор — спецыяльныя курсы для падрыхтоўкі арганізатараў партызанскага руху. Да лістапада было падрыхтавана больш за 2800 інструктараў па вядзенні партызанскай вайны.

партызанскі атрад, які ўступіў у бой з захопнікамі. Гэта быў адзін з першых партызанскіх атрадаў у Беларусі. Узначальваў яго В. З. Корж. У гэты ж час у Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці быў арганізаваны партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік», які ўзначалілі Ц. П. Бумажкоў і Ф. І. Паўлоўскі — першыя з савецкіх партызан, якім 6 жніўня 1941 г. было нададзена званне Героя Савецкага Саюза.



Байцы Беларускага асобага ваеннага збору прымаюць прысягу перад адпраўкай у тыл ворага. РСФСР, Уладзімірская вобласць. 1942 г.

Разгром немцаў пад Масквой станоўча адбіўся на актывізацыі патрыятычнага руху ў Беларусі. У выніку контрнаступлення савецкіх войскаў узнік 40-кіламетровы разрыў нямецкага фронту на стыку груп армій «Поўнач» і «Цэнтр» — паміж Веліжам і Усвятамі, які атрымаў назву «Віцебскія (Суражскія) вароты». Праз «Віцебскія вароты» ў нямецкі тыл былі перапраўлены 20 партызанскіх атрадаў, 102 арганізатарскія і 62 дыверсійныя групы, якія налічвалі больш за 3 тыс. чалавек. Гэта дазволіла наладзіць сувязь ЦК КП(б)Б з дзеючымі атрадамі, палепшыць іх узбраенне, папоўніць партызанскія фарміраванні кваліфікаванымі кадрамі, інструктарамі падрыўной справы.

Да пачатку 1943 г. узброеную барацьбу ў Беларусі супраць захопнікаў вялі 56 брыгад, якія аб’ядноўвалі 220 атрадаў. З узрастаннем партызанскіх сіл павялічвалася і іх баявая актыўнасць. Партызаны вызвалялі ад ворага цэлыя раёны. На гэтай тэрыторыі фарміраваліся партызанскія зоны (іх было больш за 20). У іх улада пераходзіла да партызан і адноўленых органаў савецкай улады. Да канца 1943 г. пад кантролем партызан знаходзілася каля 60 % тэрыторыі Беларусі. Гэта было самае магутнае супраціўленне акупантам у Еўропе.

Да сярэдзіны 1942 г. партызанскі рух прыняў такія маштабы, што ўзнікла неабходнасць стварэння каардынуючага цэнтра. 30 мая 1942 г. былі створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР), а таксама Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР).

Неабходна заўважыць, што эфектыўная партызанская барацьба была б немагчымай без шырокай падтрымкі мясцовага насельніцтва. Яно забяспечвала партызан

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Канкрэтызуйце прыкладамі вывад аб узаемасувязі паміж баявымі дзеяннямі на савецка-германскім фронце і актывізацыяй падпольнай і партызанскай барацьбы на акупіраваных тэрыторыях.*

прадуктамі, вопраткай, збірала разведвальныя даныя, а таксама ўступала ў партызанскія атрады.

Партызанская барацьба вялася ў цесным узаемадзеянні з падполлем. У гарадах і вёсках, якія знаходзіліся пад акупацыяй, ствараліся партыйныя, камсамольска-маладзёжныя органы і арганізацыі.



Мініраванне чыгуначнага палатна. Бягомльскі раён. 1944 г.

Актыўным было падполле ў Мінску, Віцебску, Оршы, Асіповічах. Дзеячы гэтых падпольных груп ажыццявілі найбольш гучныя акцыі супраць нямецкіх акупантаў. Так, 30 ліпеня 1943 г. на чыгуначнай станцыі Асіповічы Ф. Крыловічам была здзейснена буйнейшая дыверсія Другой сусветнай вайны: знішчаны адразу чатыры ваенныя эшалоны з боепрыпасамі і ваеннай тэхнікай. А ў верасні таго ж года ўдзельніцамі мінскага падполля А. Мазанік, М. Осіпавай, Н. Траян быў ліквідаваны генеральны камісар Беларусі В. Кубэ.

1943 г. стаў годам карэннага пералому ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах. Пасля разгрому нямецкай арміі пад Сталінградам, Арлом і Курскам стратэгічная ваенная ініцыятыва перайшла да Чырвонай арміі.

На акупіраванай фашыстамі тэрыторыі ў гэты час разгарнулася актыўная **«рэйкавая вайна»** — аперацыя партызан па масавым разбурэнні чыгунак з мэтай дэзарганізацыі нямецкіх ваенных перавозак. У Беларусі яна праводзілася ў тры этапы.

Першы этап «рэйкавай вайны» праходзіў у пачатку жніўня 1943 г., калі савецкія войскі пачалі контрнаступленне пад Курскам. У выніку на 40 % скараціліся перавозкі для нямецкіх армій на фронце. Другі этап «рэйкавай вайны» пад назвай «Канцэрт» праводзіўся ў другой палове верасня — кастрычніку 1943 г., калі Чырвоная армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі. Трэці этап пачаўся ў ноч на 20 чэрвеня 1944 г. напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі і працягваўся да поўнага вызвалення рэспублікі.

**Вызваленне Беларусі.** Атрымаўшы перамогу ў Курскай бітве, Чырвоная армія працягнула наступленне і ўвосень 1943 г. уступіла на тэрыторыю Беларусі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Маршал А. М. Васілеўскі і генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі ў час допыту нямецкага генерала, узятага ў палон пад Віцебскам

22 верасня быў вызвалены першы раённы цэнтр БССР — Камарын. У выніку асенне-зімовага наступлення савецкія войскі вызвалілі абласныя цэнтры — Гомель і Мазыр.

У 1944 г. пачаўся завяршальны этап Вялікай Айчыннай вайны — поўнае выгнанне акупантаў з савецкай зямлі, вызваленне народаў Еўропы ад нацыстаў і разгром гітлераўскай Германіі. Значную ролю ў вырашэнні гэтых задач адыграла Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Для наступлення прыцягваліся войскі франтоў: 1-га Беларускага (камандуючы генерал арміі К. К. Ракасоўскі), 2-га Беларускага (генерал-палкоўнік Г. Ф. Захараў), 3-га Беларускага (генерал-лейтэнант І. Д. Чарняхоўскі), 1-га Прыбалтыйскага (генерал арміі І. Х. Баграмян), а таксама Дняпроўская флатылія і партызаны. Дзеянні франтоў каардынавалі маршалы Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі і Г. К. Жукаў.

Наступленне франтоў пачалося 23 чэрвеня 1944 г. На трэці дзень быў вызвалены Віцебск, а затым — Орша. 3 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Мінск. У ходзе далейшага наступлення савецкія войскі 28 ліпеня вызвалілі горад Брэст.

*Даведайцеся, імёны якіх беларускіх гарадоў былі нададзены воінскім часцям і злучэнням, што праславіліся пры вызваленні Беларусі.*

**Унёсак беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі.** Беларускі народ зрабіў значны ўнёсак у перамогу над ворагам. На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагалася больш за 1,3 млн выхадцаў з Беларусі. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі гераічна супрацьстаялі ворагу 374 тыс. партызан. Мужную барацьбу вялі 70 тыс. падпольшчыкаў.

За гераізм і мужнасць 140 тыс. беларускіх партызан і падпольшчыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, 95 чалавек атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. За доблесць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з захопнікамі, звыш 300 тыс. салдат і афіцэраў — ураджэнцаў Беларусі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Больш за 400 воінаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, а П. Я. Галавачову, І. І. Гусакоўскаму, С. Ф. Шутаву, І. І. Якубоўскаму гэтае званне было нададзена двойчы.

Выхадцы з Беларусі змагаліся з нацызмам у еўрапейскім руху Супраціўлення — у Францыі, Італіі, Бельгіі, Чэхаславакіі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У ходзе эвакуацыі з тэрыторыі Беларусі ва ўсходніх рэгіёнах СССР апынулася звыш 1,5 млн чалавек. Сваёй самаадданай працай яны зрабілі вялізны ўнёсак у перамогу над ворагам, забяспечваючы франты зброяй, тэхнікай, боепрыпасамі, медыкаментамі і харчаваннем. Працоўны подзвіг дзясяткаў тысяч беларусаў быў адзначаны ордэнамі і медалямі.

Беларускі народ заплаціў высокую цану за перамогу над нацызмам. За гады Другой сусветнай вайны Беларусь страціла каля 3 млн чалавек. Матэрыяльная шкода склала 75 млрд руб. у цэнах 1941 г., што ў 35 раз перавышала бюджэт БССР 1940 г. Па ўзроўні прамысловага развіцця рэспубліка была адкінута на ўзровень 1913 г.

**1.** Назавіце геапалітычныя фактары, якімі было абумоўлена ўступленне 17 верасня 1939 г. часцей Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь.
**2.** Ахарактарызуйце геапалітычнае становішча Беларусі напярэдадні нападзення Германіі на СССР. У чым былі яго мінусы і плюсы?
**3.** Растлумачце, чаму абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі ўлетку 1941 г. мелі стратэгічнае значэнне.
**4.** У чым, па вашым меркаванні, заключаліся вытокі мужнасці беларускага народа ў барацьбе супраць захопнікаў? Паглядзіце мастацкі фільм «Брэсцкая крэпасць». Як у ім паказаны крыніцы гераізму яе абаронцаў?
**5.** Ацаніце ўнёсак беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі.

§ 18

## § 18. БССР на міжнароднай арэне ў 1940–1980-я гг.

Прывядзіце 5 фактаў, якія пацвярджаюць вывад аб вялізных стратах БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны і аб яе ўнёску ў разгром нацызму.

**Дзейнасць БССР у ААН.** Яшчэ ў ходзе Другой сусветнай вайны лідарамі СССР, ЗША і Англіі было прынята рашэнне аб стварэнні аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі, якая вырашала б важнейшыя сусветныя праблемы і выступала гарантам міру і бяспекі на зямлі, — Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).

Каб узмацніць свой уплыў на дзейнасць ААН, урад СССР прапанаваў прызнаць паўнапраўнымі членамі новай арганізацыі ўсе саюзныя рэспублікі, у тым ліку і БССР. Але саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі згадзіліся ўключыць у лік краін — заснавальнікаў ААН толькі Беларусь і Украіну, улічваючы іх унёсак у разгром нацызму, вялізныя людскія і матэрыяльныя страты.

У маі 1945 г. прадстаўнікі БССР прынялі ўдзел у працы канферэнцыі па заснаванні ААН у Сан-Францыска. 25 чэрвеня 1945 г. дэлегацыя БССР разам з дэ-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ